20 год Гродзенскай дыяцэзіі (10)

Аўтар: Рэдакцыя
09.06.2011 03:00



1999 год

30 кастрычніка

У Пабернардынскім касцёле ў Гродне кс. біскуп Антоні Дзям'янка ўдзяліў святарскія пасвячэнні сямі дыяканам.

25 снежня

У гродзенскай катэдры адбылося святкаванне вялікага юбілею хрысціянства ў нашай дыяцэзіі. † 2000 год

5 сакавіка

Рым: урачыстасці беатыфікацыі сёстраў-назарэтанак з Навагрудка. Ва ўрачыстасцях прыняла ўдзел шматлікая група пілігрымаў з нашай дыяцэзіі.

13 сакавіка

У Шчучыне ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў святарскія пасвячэнні дыякану Віктару Занеўскаму. Гэта былі першыя святарскія пасвячэнні сярод мясцовых пакліканняў айцоў-піяраў.

19 сакавіка

У гродзенскай катэдры адбыўся юбілейны з'езд рамеснікаў нашай дыяцэзіі. Цэлебраваў урачыстую св. Імшу ксёндз біскуп Антоні Дзям'янка.

7 мая

Юбілейная сустрэча пажарнікаў нашай дыяцэзіі. Галоўным цэлебрантам св. Імшы быў ксёндз біскуп Антоні Дзям'янка, а ля алтара стаяла каля 40 пажарнікаў у парадных мундзірах.

11 мая

У мікрараёне Паўднёвы ў Гродне адбылася кансэкрацыя касцёла Беззаганага Зачацця НПМ. Галоўным цэлебрантам св. Імшы быў ксёндз арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч.

13 мая

У гродзенскай катэдры кс. біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў дыяканскія пасвячэнні адзінаццаці кандыдатам у святарства.

3 чэрвеня

У гродзенскай катэдры кс. біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў святарскія пасвячэнні 6 новым дыяканам.

11 чэрвеня

Асвячэнне касцёла Унебаўзяцця НПМ у Капцёўцы. Галоўным цэлебрантам св. Імшы быў ксёндз біскуп Казімір Рычан з Кельцаў.

12 чэрвеня

Ксёндз біскуп Антоні Дзям'янка быў прызначаны рэктарам ВДС у Гродне.

23 – 25 чэрвеня

У Гродзенскай дыяцэзіі адбыўся I Эўхарыстычны кангрэс

24 чэрвеня

У Смаргоні кс. біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў святарскія пасвячэнні дыякану Аляксандру Яшэўскаму з супольнасці ксяндзоў-тэрцыянаў.

26 – 28 чэрвеня

У Гродне ў м-не Дзевятоўка адбыўся I фестываль рэлігійнай песні "Te Deum Laudamus".